УДК 93 (476) (092)

**Папко В.М.**

# XI НЯСВІЖСКІ АРДЫНАТ КНЯЗЬ ДАМІНІК ГЕРАНІМ РАДЗІВІЛ (1786–1813)

***Уводзіны.*** Род князеў Радзівілаў прыцягвае да сябе ўвагу не толькі гістарыкаў, але і аматараў даўніны. Прадстаўнікі гэтага роду займалі пасады на беларускіх землях, адыгрывалі значную ролю ў эканамічным, палітычным і культурным жыцці некалькіх дзяржаў. Аўтар артыкула на падставе аналіза польскамоўных крыніц XIX ст., дадзеных Вільнюскага дзяржаўнага гістарычнага архіва разглядае жыццёвы шлях аднаго з прадстаўнікоў роду – князя Д.Г. Радзівіла.

***Біяграфія Дамініка Гераніма Радзівіла.*** 4 красавіка 2006 г. (па іншых звестках 14 жніўня) споўнілася 220 гадоў са дня нараджэння апошняга афіцыйнага прадстаўніка нясвіжскай лініі рода Радзівілаў, XI нясвіжскага ардыната, князя Дамініка Гераніма. Усё яго кароткае жыццё, ад самага нараджэння да заўчаснай смерці было напоўнена багатымі падзеямі, прыгодамі, вандроўкамі, а часам і проста загадкамі, якія не маюць адказу да сёнешняга часу. У гэтым жыцці было і палкае каханне да прыгожай пляменніцы, і удзел у вайне 1812 г. на баку Напалеона.

Яго бацька, кн. Геранім Вінцэнт Радзівіл (1759-1786) быў любімым малодшым братам кн. Караля Станіслава “Пане Каханку” (1734-1790). Адносіны паміж братамі, у якіх, між іншым, былі розныя маці і 25 гадоў розніцы, былі вельмі добрыя. Вымушаны з-за падзелаў Рэчы Паспалітай, актыўным праціўнікам якіх ён выступаў, пакінуць свае ўладанні і збегчы за мяжу, “Пане Каханку” узяў з сабой свайго брата. Менавіта там, у выгнанні, кн. Геранім Вінцэнт пазнаёміўся з маладзенькай нямецкай князёўнай Соф’яй фон Турн-Таксіс (1758-1808). У 1775 г. адбылося вяселле, маладыя былі моцна закаханыя адзін ў аднаго. Аднак шлюб гэты нельга было назваць шчаслівым. Маладая княгіня Радзівіл мела дрэнны характар. Адносіны паміж мужам і жонкай сапсаваліся, палкае каханне перайшло ў нянавісць.

У 1784 г. кн. Соф’я уцякла ад мужа з рэзідэнцыі ў Белай Радзівілоўскай (зараз Бяла-Падляска) з прыдворным музыкантам па прозвішчы Душак. “Пане Каханку” змог вярнуць яе мужу, аднак той быў настроены развесціся са сваёй нявернай жонкай. У такіх абставінах у красавіку (або ў жніўні) 1786 г. на свет з’явіўся кн. Дамінік Геранім. Хутка з невядомай прычыны памёр кн. Геранім Вінцэнт. Апекуном немаўляці стаў яго дзядзька, кн. Караль Станіслаў “Пане Каханку”. Княгіня Соф’я была адсунута ад выхавання сына. Яна выходзіла замуж яшчэ два разы — за Анджэя Казанроўскага і графа Мікалая Астрарога, памерла ў 1808 г. [9, 323-325]

У 1790 г. памёр “Пане Каханку”. Яго пляменніку на той момант было толькі 4 гады, але ён апынуўся адзіным спадкаемцам вялізарнай спадчыны самай багатай лініі рода князёў Радзівілаў — нясвіжскай. Кн. Дамінік атрымаў дзве з трох радзівілаўскіх ардынацый — нясвіжскую і алыцкую. Аднак на маёнтках маленькага князя віселі гіганцкія пазыкі, якіх нарабілі яго дзядзька і бацька. Не адзін год цягнуліся судовыя разбіральніцтвы наконт выплатаў гэтых пазык. Нягледзячы на гэта, на той момант кн. Дамінік быў самым багатым чалавекам на тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага.



***Іл. 1.*** *Князь Дамінік Геранім Радзівіл*

Паўстала пытанне аб апекуне для маленькага хлопчыка і яго велізарных маёнткаў. Існавала два галоўных прэтэндэнта на гэтую ролю. Першы з іх, кн. Мацей Радзівіл быў зводным братам бацькі Дамініка. Другі прэтэндэнт на месца апекуна, кн. Міхал Геранім Радзівіл быў стрыечным братам кн. Гераніма Вінцэнта. Паміж гэтымі двума родзічамі пачалася барацьба, канчатковай мэтай якой стала магчымасць кіраваць багаццямі рода. Сам жа хлопчык нікога не цікавіў і быў папросту занядбаны. Родзічы накіравалі кн. Дамініка ў Пулавы, дзе ён каля трох гадоў вучыўся разам з дзецьмі з арыстакратыцкіх сем’яў пад наглядам кн. Чартарыйскіх. У рэшце рэшт спрэчка наконт апекунства была вырашана на карысць кн. Міхала Гераніма, які выконваў абавязкі апекуна з 1793 па 1804 г., калі кн. Дамінік быў прызнаны паўналетнім і пераехаў з Пулаў у свае беларускія маёнткі. У Вільні адбылася цэрэмонія прысягі маладога князя перад генералам-губернатарам, пасля якой кн. Дамінік паехаў у Пецярбург, дзе ён заставаўся каля паловы года да красавіка 1805 г. [6, 416]

Пасля атрымання маёнткаў з рук апекуна, кн. Дамінік меў да яго шмат прэтэнзій наконт таго, як вялася гаспадарка. Адносіны паміж імі значна пагоршыліся. Аднак, сам па сабе, як ардынат і гаспадар вялікіх зямельных уладанняў, кн. Дамінік не адрозніваўся ні разважлівасцю, ні эканомнасцю. Кн. Дамінік актыўна прадаваў свае маёнткі. Не гледзячы на гэта, ён не толькі не паплаціў пазыкі свайго дзядзькі і бацькі, але і нарабіў сваіх.

Вясной 1806 г. рэзідэнцыю ў Нясвіжы наведала 15-цігадовая Тэафіля Мараўская, жонка графа Старжэньскага. Бабка Тэафілі, таксама Тэафіля, была роднай сястрой кн. “Пане Каханку” і зводнай сястрой кн. Гераніма Вінцэнта. У свае маладыя гады яна лічылася асобай экстравагантнай, выйшла замуж за небагатага шляхціца Ігнацыя Мараўскага насуперак радзівілаўскіх традыцый. Сучаснікі часта параўноўвалі ўнучку з бабкай і лічылі, што свой характар Тэафіля атрымала ад бабкі. Паміж князем-ардынатам і яго прыгожай, вясёлай пляменніцай пачаўся раман, якая ўжо восенню пакінула мужа і пераехала ў Нясвіж [5, 32-34].

Атрымаўшы магчымасць свабодна распараджацца сваёй маёмасцю, малады арыстакрат вёў разгульнае жыццё. Яго мала цікавілі праблемы ардынацый, вялізныя сумы Дамінік траціў на падарункі сябрам і халасцяцкія забавы, утрыманне коней. У гэтыя гады ў Нясвіжскім замку былі разбудаваны цудоўныя стайні, упрыгожаныя мармурам. Занепакоеныя такімі схільнасцямі і раманам з Тэафіляй родзічы імкнуліся ажаніць кн. Дамініка. У лютым 1807 г. адбылося яго вяселле з 16-цігадовай графіняй Ізабэлай Мнішак. Ізабэла пасялілася ў Нясвіжы, а побач у багата ўбраных пакоях жыла Тэафіля. Гэтая нялепая сітуацыя была праз два тыдні вырашана самім Дамінікам: ён папросту адаслаў маладзенькую жонку да бацькоў, а сам з Тэафіляй паехаў ў Варшаву і далей у Аўстрыю [5, 48-51].

1 ліпеня 1808 г. кн. Дамінік звярнуўся ў Люблінскі шляхецкі суд з заявай аб разводзе з Ізабэлай Мнішак. У тыя часы працэдура развода цягнулася даволі доўга, і толькі 15 студзеня 1809 г. выйшаў дыкрэт аб разводзе. Па неправераных дадзеных, за развод з жонкай князь заплаціў Мнішкам 2 млн. злотых, грошы па тых часах вялізныя. Праўнук кн. Дамініка, Аляксандр Фрэдэрык Радзівіл напісаў невялікую кнігу аб гісторыі сваіх продкаў “Лёсы найстаршай лініі князёў Радзівілаў”, надрукаванай ў Вільна ў 1926 г. Ён сцвярджаў, што Дамінік сустрэў Тэафілю на сваім вяселлі з Ізабэлай. Збеглі яны яшчэ з вяселля і адразу выехалі ў Вену, дзе абодва падалі заявы аб разводзе. Тут, у аўстрыйскім Грацы 29 лютага 1808 г. Тэафіля нарадзіла сына Аляксандра Дамініка. 15 сакавіка 1809 г. адбылося вяселле Дамініка і Тэафілі ў Мінску [7, 2-3].

Доўгі час гісторыя гэтага шлюбу кн. Дамініка, яго кахання да Тэафілі Мараўскай не мела дакладнага тлумачэння. Даследчыкі блыталі ход падзей, прыдумвалі прыгожыя легенды, пераўтварыўшы ў міф аб тым, як кн. Дамінік украў сваю прыгожую пляменніцу проста з яе вяселля са Старжэньскім. І хаця да гэтага часу застаецца невысветленым, чаму кн. Дамінік ажаніўся з Мнішак, калі на той момант быў закаханы ў Мараўскую, з дапамогай крыніц і справы аб разводзе стала зразумела канва тых падзей. Легенда аб выкраданні Тэафілі з вяселля не пацвердзілася.

**Попко Ольга Николаевна,** *старший преподаватель кафедры философии и культурологии Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БрГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*



**Іл. 2.** *Тэафіля Мараўская. Партрэт Юзафа Пешкі*

Каханкі вялі жыццё, поўнае лёгкадумнай весялосці. Захаваліся ўспаміны Леона Патоцкага аб гасцяванні кн. Дамініка ў графа Тышкевіча падчас свіслацкага кірмашу ў 1806 г. У Свіслачы князь размясціўся ў карчме "Пад арлом", з якой выселілі яўрэяў, пакоі абставілі мэбляй з Варшавы і абабілі парчой. Разам з кн. Дамінікам прыбыло кала 60 коней. Побач у другой карчме у такой самай раскошы жыла прыгажуня Тэафіля. Аднойчы стары граф Тышкевіч чакаў сваіх гасцей да абедзенага стала. "Раптам загрукацела на разводным мосце. І на поўным ходзе чацвёра англійскіх коней, запрэжаных у двухколку, заехалі пад ганак, выбудаваны па апошней модзе. З яе вылезлі абедзве дамы, што пазніліся, а з коней саскочылі кн. Дамінік і Лопат, яго неадступны фаварыт, абодва апранутыя пад жакеяў.

Толькі князь паспеў скінуць пунсовую куртку і надзець фрак, рэферэндарый (Тышкевіч), выходзячы яго спаткаць: "Каго маю гонар вітаць у маім доме, — загуў дрыжачым ад гневу голасам, — ці не князя конюхам, ці конюха князем? Да чаго гэта, зжальцеся, дашло? Яшчэ нядаўна сябры с. п. Кн. Караля насілі радзівілаўскі колер, а сёння Радзівілы надзяваюць ліўрэй сваіх слугаў!" [4, 35-37] Пасля кн. Дамініка засталося безліч успамінаў пра падобныя кур'ёзы.

У снежні 1810 г. кн. Дамінік уступіў у армію Княства Варшаўскага. Да гэтага часу дакладна невядома, што падштурхнула яго да гэтага крока. Чаму ён вырашыў здрадзіць прысязе на вернасць Аляксандру I, якую даваў шчыра, што відаць з яго лістоў? Да палітычнага жыцця князь цікавасці не праяўляў, заняты сваімі асабістымі справамі. Магчыма, акружэнне князя падштурхнула яго да гэтага ўчынку. Аднак было шмат бакоў, зацікаўленых у багаццях і галосным прозвішчы маладога арыстакрата. Звязана гэта з тым, што кн. Дамінік на свае грошы ўзбройваў і ўтрымліваў войска, якое потым ўдзельнічала ў вайне 1812 г. на баку Напалеона. Напрыклад, у сакавіку 1811 г. кн. Дамінік падпісаў абавязак выплаціць на карысць польскага войска 180 тыс. злотых, на вайсковую адукацыю 36 тыс. злотых, перадаць 100 коней. Такіх грошай князь пры сабе не меў, таму пазычыў іх у кн. Юзафа Панятоўскага. Кн. Дамініку ахвотна пазычалі вялікія сумы. Залогам таго, што пазыка будзе вернута служыла вялізная нерухомая маёмасць Радзівіла. Па дадзеных за 1810 г. князь Дамінік меў штогадовага доходу 3 461 668 польскіх злотых і 19 грошаў, а даходы з лясных угоддзяў складалі каля 200 тыс. злотых штогадова [2, 2]. Польскі даследчык Д. Наўрот лічыць, што ўся маёмасць кн. Дамініка каштавала 200 млн. злотых, яму належыла 120 тыс. мужчынскіх душаў прыгонных [6, 429].

У 1811 г. кн. Дамінік узброіў за свой кошт полк № 8 Варшаўскага княства, на чале якога яго паставіў імператар Напалеон. Дзякуючы гэтаму 1 красавіка 1811 г. 25-цігадовы кн. Дамінік быў прызначаны палкоўнікам польскага войска, не маючы ніякай ваеннай адукацыі і вопыту вядзення ваенных дзеянняў. 6 мая "свежаспечаны" палкоўнік узначаліў 8 полк уланаў, са снежня 1811 г. да сакавіка 1812 г. знаходзіўся ў Плоцку, дзе квартараваў яго полк. Полк налічваў звыш 800 уланаў, якія мелі значна больш вопыту ў вайсковых справах, чым іх кіраўнік. У той самы час рускія ўлады секвестравалі шматлікія маёнткі князя, якія знаходзіліся ў межах Расійскай імперыі [6, 419]. На чале свайго палка кн. Дамінік у складзе французскай арміі перайшоў Неман і накіраваўся ў Вільна. У парадных мундзірах афіцэры, уланы і сам князь першымі ўвайшлі ў старажытную сталіцу ВКЛ. Факт гэты меў сімвалічны сэнс і быў адзначаны ўсімі мемуарыстамі. Падчас бітваў кн. Дамінік паказаў сябе добрым кавалерыстам, смела і безаглядна скакаў наперадзе свайго палка і біўся адважна. Удзельнічаў у бітве пад Барадзіном, не пакінуў французскае войска нават тады, калі было зразумела, што Напалеон прайграе і пачалося дызертырства [6, 428].

У 1812 г. маёнткі кн. Дамініка Радзівіла былі канфіскаваны расійскімі ўладамі. У аб'яве, надрукаванай у газеце «Кур'ер Літоўскі» 8 ліпеня 1814 г., гаварылася: «Аказалася, што ніжэй пералічаныя грамадзяне і іншага стану людзі, злучыўшыся з непрыяцелем, адныя з іх з ім разам выдаліліся, другія ж самавольна, без урадавага дазвалення за мяжу выехаўшы, не вярнуліся на перыяд, назначаны Найвызшым Маніфестам, ад 12 снежня 1812 г., маёнткі якіх падлягалі канфіскацыі…» [8, 5-6] Першым у гэтым спісе, які складаўся больш як з 70 імёнаў, стаіць прозвішча кн. Дамініка Радзівіла.

Удзел кн. Дамініка ў вайне супраць Расіі на баку Напалеона прынёс вялікія страты для яго маёнткаў, вельмі пацярпелі і землі нясвіжскай ардынацыі. Войскі адмірала Чычагава, якія ўвайшлі ў Нясвіж у пачатку лістапада 1812 г., вывозілі з замку каштоўныя зборы, пашкодзілі архіў. У снежні горад і замак рабавалі салдаты генерала Тучкова. Страты налічвалі каля 10 млн. злотых [6, 416-425]. У 1813 г. эпідэміі ў Мінскай губерніі значна паменшылі насельніцтва радзівілаўскіх ўладанняў, у некаторых з іх нават ў два разы. Гэта паўплывала на памяншэнне даходаў [1, 3 адв.].

Апошняй бітвай для 27-гадовага князя стала бітва пры Ханаў 30 кастрычніка, у якой ён быў паранены ў галаву. 11 лістапада 1813 г., ад атрыманых ран ён памёр у Францыі. Генерал Красінскі, сябра Радзівіла з часоў стаяння ў Маскве, апекаваўся яго целам, якое пахаваў у Варшаўскім касцёле капуцынаў, а сэрца адвёз на сваю радзіму [6, 430]. У польскім мястэчку Красным, у касцёле ў сцяну замуравана скрынка з надпісам: "Сэрца Даміініка Радзівіла князя на Нясвіжы, Алыца, маёра польска-французкай гвардыі Імператара Напалеона, які памёр у Lantheron у Францыі 11 верасня 1813 г. ад атрыманых ран у бітве пад Ханаў, тут пакладзены яго былым палкоўнікам графам Вінцэнтам Красінскім, генералам дывізіі у 1816 г." [10, 174].



**Іл. 3.** *Гроб кн. Даміініка Гераніма Радзівіла ў Красным*

З яго смерцю афіцыйна згасла старэйшая мужчынская лінія роду Радзівілаў, як у старажытнасці гаварылі – "па мячы". Між іншым, князь пакінуў пасля сябе сына і дачку. Лёгкадумнасць кн. Даміініка і Тэафілі цяжка адбілася на лёсе іх адзінага сына Аляксандра Даміініка. З прычыны, што бацькі не былі афіцыйна ў шлюбе, ён лічыўся пазашлюбным дзіцём і не меў права прэтэндаваць на княжацкі тытул, ардынацыі і іншыя багацці бацькі. Аляксандр Радзівіл выхоўваўся ў Вене, маці вельмі рэдка наведвала яго падчас сваіх вандровак па Еўропе. У Расіі ён быў пазбаўлены права выкарыстоўваць тытул князя, пасля доўгіх спроб дабіўся гэтага ў Аўстрыйскай імперыі [10, 174]. Аўтару гэтага артыкула давялося трымаць у руках некалькі дакументаў архіва кн. Даміініка, на якіх было ўказана, што яны пазычаліся яго сыну. Аляксандр падрабязна даследаваў дакументацыю, спадзяючыся даказаць сваё законнае паходжанне. 24 кастрычніка 1822 г. аўстрыйскія ўлады падцвердзілі права Аляксандра Даміініка на княжацкі тытул і прозвішча Радзівіл [7, 7]. Усё жыццё яго было звязана з Галіцыяй і Венай, памёр ён 10 кастрычніка 1859 г. Апошняй прадстаўніцай гэтай галіны рода стала праўнучка Аляксандра Радзівіла, Марыя Максімільяна, якая нарадзілася ў 1908 г. [9, 326].

Яго малодшая сястра, кн. Стэфанія нарадзілася 9 снежня 1809 г. ужо пасля вянчання бацькоў, таму лічылася законнай. Аднак і яе лёс быў складаным і кароткім. Пазбаўленая любві з боку маці, якая ў час яе дзяцінства займалася ўладкаваннем свайго асабістага жыцця, князёўна выхоўвалася ў інстытуце шляхетных дзяўчынак. Яе шлюб з кн. Людвігам Сайн-Віттгенштэйнам у 1828 г. быў арганізаваны імператарскім дваром. Кн. Стэфанія памерла 26 ліпеня 1832 г., пакінуўшы пасля сябе сына Пятра і дачку Марыю. Кн. Пётр памёр бяздзетным, а кн. Марыя стала жонкай канцлера Германіі кн. Хлодвіга Гогенлоэ (1819-1901) [3, 202].

Пытанне з лёсам ардынацыі вырашалася вельмі марудна. Указам імператара Аляксандра I ад 24 лютага 1814 г. была складзена «Комиссия по Высочайшему Повелению Устройства Радзивилловских дел учреждённая», якая атрымала назву Радзівілаўскай і мела некалькі мэт сваёй дзейнасці. Камісія павінна была аддзяліць маёмасць ардынацый ад спадчынных маёнткаў, якія атрымлівала кн. Стэфанія. Другой задачай было вырашэнне пытання з пазыкамі, якія засталіся пасля смерці кн. Даміініка: выявіць крэдытораў, арганізаваць продаж маёмасці для ліквідацыі пазык. Трэцяй важнай задачай дзейнасці камісіі была апека над маёнткамі непаўналетняй кн. Стэфаніі. Перадача ардынацый ў рукі прадстаўніка іншай галіны роду спавадавала неабходнасць дакладнага вывучэння гісторыі закупкі тых ці іншых маёнткаў і вёсак, каб разабрацца, да якой катэгорыі маёмасці іх аднесці: ардынацыі або аладыяльных маёнткаў. Усё гэта, разам са шматлікімі судовымі цяжбамі па размежаванні межаў маёнткаў, зацягнула працу камісіі на дзесяцігоддзі [2, 2]. Уся гіганцкая, не гледзячы на пазыкі і судовыя справы, спадчына кн. Даміініка была падзелена на дзве часткі. Ардынацыі трапілі ў рукі траюраднаму брату, кн. Антонію Генрыку Радзівілу, сыну колішняга апекуна кн. Даміініка. Кн. Стэфанія атрымала ў спадчыну гарады Слуцк, Капыль, Бяла-Падляску, мястэчкі Мір, Карэлічы, Глыбокае, Смалявічы, цалкам больш за 1, 2 млн. дзесяцін зямлі і як мінімум 40 тыс. душ прыгонных [3, 202].



**Іл. 4.** *Аляксандр Дамінік Радзівіл*

***Заключэнне.*** Князь Дамінік Геранім Раздзівіл (1786-1813 гг.), XI нясвіжскі ардынат, гаспадар вялікіх зямельных уладанняў пасля пераходу ў час вайны 1812 г. на бок Напалеона страціў не толькі радавыя маёнткі, пацярпелі і зямлі нясвіжскай ардынацыі. З яго смерцю афіцыйна згасла мужчынская лінія Радзівілаў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Бібліятэка Літоўскай Акадэміі навук, аддзел рукапісаў, F9-1272.
2. Вільнюскі дзяржаўны гістарычны архіў. – Ф. 459. – Воп. 1. – Спр. 3991.
3. Вітгенштэйны // Беларуская энцыклапедыя. – Т. 4. – Мінск. – 1997. – С. 202.
4. Патоцкі Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану. – Мінск. – 1997. 270 с.
5. Jastrzębska M. Historia pięknej kobiety. Opowieść o Teofili z Morawskich Radziwiłłowej. – Poznań. – 2000. – 167 s.
6. Nawrot D. Dominika Radziwiłła przypadki na polu chwały// Radziwiłłowie. Obrazy literackie. Biografie. Świadectwa historyczne. – Lublin. – S. 415–430.
7. Radziwiłł A. F. Losy najstarszej linji xiążąt Radziwiłłów. – Wilno. – 1926. – 11 s.
8. Zgłoszenie // Kuryer Litewski. – 1814. – 8 lipca. – № 53. – С. 5–6.
9. Zielinska T. Poczet polskich rodow arystokratyckich. – Warszawa. – 1997. – 592 s.
10. Złota księga szlachty polskiej. Pod red. Teodora Zychlińskiego. – Rocznik XI. – Poznań. – 1889.


*Материал поступил в редакцию 16.11.07*

**PAPKO V.M. The XI owner of Neswizh entail prince Dominic Heronim Radziwill (1786–1813)**

Dominic Heronim Radziwill was the representative of one of the richest and notable families in belarussian history. He was the XI owner of Neswizh entail, last representative of this branch of the family. The article tells about the life and activity of Dominic, who was the participant of military campaigns of Napoleon against Russian army in 1812-1813. The author specifies some facts from the life of this extraordinary person.